# ЛЯЛЬКІ ЯК ЛЮДЗІ



**«MONEYкеншчыцы. Iznanka». Пад такой, у пэўным сэнсе прэтэнцыёзнай, назвай днямі ў Мінску адкрылася першая персанальная выстава папулярнай беларускай тэлевядучай Ірыны Ханунік-Рамбальскай.**






Калі быць дакладным, Ірына знаёмая шырокай публіцы ў розных амплуа: актрыса, мадэль, удзельніца і пераможца многіх конкурсаў прыгажосці; а цяпер, як высветлілася, і стваральніца аўтарскіх скульптурных лялек. Наноў адкрыты талент тэлевядучай уразіў нават міністра культуры Барыса Святлова, які ў ліку першых ганаровых гасцей наведаў выставу. «Для мяне гэта вельмі нечаканы паварот у творчасці Ірыны», — адзначыў міністр, з цікавасцю разглядаючы галоўных персанажаў.

Натуральна, мы маем на ўвазе не акцёраў пластычнага тэатра «ІнЖэст», якія адкрылі экспазіцыю пантамімай, і не мноства запрошаных свецкіх асоб: ад дзеячаў айчыннага мастацтва і шоу-бізнэсу да заморскага госця — італьянскага дызайнера абутку Маўрыцыа Якапіні. Героямі ж дня, пасля самой Ірыны Ханунік-Рамбальскай, сталі 14 лялек — увасабленне вядомых беларускіх мадэляў у розных вобразах і сітуацыях. Гнуткія і тонкія пластыкавыя паненкі маюць натуральныя валасы, расфарбаваныя алеем, акварэллю і акрылам, вінтажнае адзенне, футра і карункі, упрыгожаныя пацеркамі і сярэбранымі дэталямі... Некаторых з іх за багаццем дэталяў і вонкавай эксцэнтрычнасцю было не пазнаць, калі б не своеасаблівыя фотападказкі — работы Міхаіла Маругі, якія дапаўнялі гісторыі лялек і людзей. З чорна-белых партрэтаў, аздобленых іранічнымі каментарыямі, за лялькамі назіралі прататыпы: «Міс Беларусь-2008» Вольга Хіжынкова, «Міс Фотамадэль свету-2011» Інэса Кунцэвіч, знакамітая беларуская мадэль Крысціна Кучынская і, безумоўна, сама Ірына Ханунік-Рамбальская.

«Адкрыццё выставы практычна супала з маім юбілеем, — прызналася гасцям аўтар праекта, маючы на ўвазе хуткае 30-годдзе. — І я вельмі рада, што гэта першы мой дзень нараджэння, дзе прысутнічае столькі цікавых і добрых гасцей, якіх проста так сабраць практычна немагчыма».

Падглядзець выварат — або, калі ўжо цалкам адпавядаць трэнду, iznank'у жыцця манекеншчыц — кожны ахвотны можа ў сталічнай галерэі «Універсітэт культуры» да 13 лютага.

**Віктар КУШАЛЬ.**



Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ